ВЕЛЬМІ ДОЎГІ ДЗЕНЬ

Даволі нечаканы візіт прэм'ер-міністра польскага ўрада Ганны Сухоцкай у Мінск зусім нечакана прымусіў мяне стаць урадавым перакладчыкам. Мая перакладчыцкая прыгода пачалася раніцай у сераду 18 лістапада 1992 г., калі ў два самалёты польская дэлегацыя паднялася ў паветра з вайсковага аэрадрома ў Варшаве.

Мінск прывітаў нас снегам і парадам ганаровага ўзвода. Узвод выглядаў сюррэалістычна, маршыруючы пад бел-чырвона-белым сцягам у сваіх савецкіх мундзірах і з зоркамі на вушанках, але што ж рабіць — не да такіх відовішчаў прывыклі мы апошнім часам.

Праца пачалася для мяне каля адзінаццатай гадзіны. Перакладаў я размовы польскай дэлегацыі пад кіраўніцтвам міністра па справах супрацоўніцтва з замежжам Анджэя Арандарскага з беларускім бокам, які ўзначальваў міністр замежных спраў Пётр Краўчанка. Тлумачачы, я зразумеў, як цяжка ладзіцца супрацоўніцтва між дзвюма дзяржавамі, якія дагэтуль практычна нічога супольнага не мелі. Польшча проста баіцца, што зальюць яе тэрыторыю натоўпы былых савецкіх грамадзян, таму, напрыклад, на адкрыццё большай колькасці прапускных пунктаў прыйдзецца пачакаць, прынамсі да часу, пакуль Беларусь не ўвядзе свае пашпарты. Затое не за гарамі беларускае консульства ў Беластоку.

Як міністр П. Краўчанка, так пасля і прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч не забывалі пра патрабаванні беларусаў у Польшчы, перш за ўсё аб заканчэнні пабудовы Беларускага музея ў Гайнаўцы і перадачы Супрасльскага манастыра праваслаўным. З боку сп. Г. Сухоцкай было дадзена абяцанне парупіцца ў гэтым.

Лёгка і прыемна перакладаліся мне прамовы падчас абеду, які выдаў у гонар сп. Г. Сухоцхай сп. В. Кебіч, тым больш, што ўсе стравы былі дасканалыя.

Выдатнай была таксама атмасфера куртуазнага візіту сп. Г. Сухоцкай у старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава Шушкевіча, які вітаў польскую дэлегацыю ў кампаніі беларускіх парламентарыяў, у тым ліку і з апазіцыі.

Пад канец пабыўкі ў Мінску пачалося хваляванне: паводле камунікатаў метэаслужбаў над Гроднам вісеў густы туман. Тым часам у Гродне чакалі сп. Г. Сухоцкую беларускія палякі. Усё ж такі прызямліліся мы шчасліва. Вітаў сп. Г. Сухоцкую гаспадар Гродзеншчыны старшыня аблвыканкама Дзмітрый Арціменя. Пасля візіту ў аблвыканкаме польская прэм'ер-міністр апынулася ўжо ў руках сваіх суродзічаў з Беларусі.

Спачатку наведала яна будынак Саюза палякаў Беларусі (будан, але будуецца новая сядзіба), скуль пераехала ў гродзенскі тэатр, дзе чакала яе каля тысячы мясцовых палякаў. Хлебам-соллю афіцыйна вітаў сп. Г. Сухоцкую старшыня Саюза палякаў Беларусі Тадэвуш Гавін. Былі спевы і патрыятычныя вершыкі, якія чыталі першакласнікі з польскіх школ.

Сама сустрэча нічым не адрознівалася ад падобных сустрэч польскіх беларусаў з дастойнымі гасцямі з Беларусі. Ідэнтычныя няспынныя нараканні на нястачу грошай, памяшканняў і наогул на недастатковую зацікаўленасць польскіх уладаў праблемамі палякаў у Беларусі.

У Варшаву вярнуліся мы пасля адзінаццаці вечара. Цэлы дзень на нагах, амаль увесь час у напружанні, ані хвіліны на адпачынак. Да гэтай палітыкі трэба мець конскае здароўе.

Што ж на канец? Візіт усвядоміў мне, як далёка нам яшчэ да нармальнага суседства і празрыстай мяжы, пра што мараць як беластоцкія беларусы, так і гродзенскія палякі.

„Ніва" н-р 50 (1909) ад 13 снежня 1992 г.

СВАЯ ЗЯМЛЯ

Богіна — вёска ў Браслаўскім раёне ў Беларусі. Трапіў я ў яе з археалагічнай экспедыцыяй, але не аб крывіцкай мінуўшчыне хачу расказаць. Як толькі наша экспедыцыя стала на беразе Богінскага возера, нейкі тубылец папярэдзіў нас: „Тут зямля фермерская, хадзіце уздоўж берагу".

„Я сябе фермерам не лічу. Сялянская ў мяне гаспадарка", — заяўляе ўладальнік зямлі Іван Селядкоў. Зямлі ў яго восем гектараў: ворыва чатыры (на двух — травы, на двух — зерняявыя), два гектары пашы і два гектары невыгоднай зямлі. А вось яго статак: адна кабыла з жарабцом, чатыры каровы, адна маёра, тры падросткі, шэсць парасят, сем авечак і сорак курэй.

Іван Селядкоў па маці паходзіць з тутэйшых стараверaў, яго жонка, Святлана, з роду Карнілавых — руская. Абаім крыху за сорак. Пазнаёміліся падчас студыяў у Педагагічным інстытуце ў Пскове. Іван закончыў яшчэ Сельскагаспадарчы інстытут у Ленінградзе. Жылі і працавалі спярша ў Пскоўскай, пазней у Ленінградскай абласцях. У пачатку 1980-х гадоў Іван прывёз жонку на бацькаўшчыну і вельмі ёй тут спадабалася. Рашылі пераехаць.

Іван уладкаваўся на працу ў богінскім калгасе. Спачатку адчуў, быццам бы ён тут непатрэбны. Працаваў звычайным машыністам. Купіў вялізную старую хату, крытую саломай. Каб яе адбудаваць, Селядковы ўлажылі ўсе свае грошы. Старая сядзіба продкаў Івана прапала падчас г.зв. нівеліроўкі. Камень на каменю не застаўся, хаця вёска Камёнка называлася. Святлана ўвесь час працуе русісткай у мясцовай школе, Іван з часам стаў галоўным аграномам у калгасе. Усё-такі не ладзіў са старшынёю. Якраз дазволілі браць зямлю.

„Змалку я адчуваў цягу да зямлі і хацеў мець сваю. Яшчэ ў маці пытаўся, як вы маглі аддаць зямлю. Даросшы, я зразумеў як гэта сталася, усё ж такі ніколі не ўспрымаў гэтай сістэмы", — кажа Іван.

„Эта бэнээфаўскія законы”, — крычаў старшыня, але зямлю выдзеліць мусіў. Абзавёўшыся зямлёю, Селядковы ўзялі крэдыт у банку, за які купілі трактар Т-25 „Уладзімірац” (крыху за слабы на тутэйшыя глебы). За свае грошы купілі касілку, акучнік, барану. Культыватар Іван зрабіў сам. Крэдыт сплацілі лёгка, бо глынула яго інфляцыя. З другога боку, тая ж інфляцыя праглынула і свае грошы, якія мелі на пачатку Селядковы (25 тысяч савецкіх рублёў). Праўду кажучы, за тыя грошы і без крэдытаў купілі б усе машыны, калі б не гэтая інфляцыя. Так, што на інфляцыі больш страцілі, чым зарабілі, але хоць не абанкруціліся.

Кабылу купіў Іван да суполкі з іншым фермерам за 10 тысяч у калгасе. Супольніку аддалі першае жарабя. Цяпер у іх ужо другое.

А як ідзе гаспадарка?

Летась прадалі 4 бычкі на тону мяса. Зарабілі 450 тысяч рублёў. Тэлевізар каштаваў тады 600 тысяч. Быў яшчэ прыбытак за малако. Калі падсумаваць усе гадавыя заробкі з гаспадаркі, дык выходзіць каля 200 долараў. Святлана мае 500 тысяч „зайчыкаў” настаўніцкай зарплаты. Ежа амаль не каштуе. Летам у лазні Селядковых над возерам затрымоўваецца брыгада з браслаўскага рыбгаса, дык і рыба ёсць. Усё-такі, калі так падлічыш усё, дык і так выходзіць малавата. З такіх заробкаў не магла ўзяцца відавочная заможнасць Селядковых.

Праўду кажучы, выратаваў іх сад. Разам з хатай набылі паўгектара старога саду. Старац, які прадаваў хату, пры Польшчы меў аграмадныя сады, каля 20 гектараў. Апошнія яблыні садзіў у 1939 г. Думаў нават пабудаваць вінзавод. Калі яго раскулачылі, не бачыў ужо перспектывы для сваіх чатырох сыноў і выправіў іх у горад, на лягчэйшае жыццё. „Ты малады, дык выцягвай”, — сказаў стары Селядкову, прадаючы яму сваю знішчэлую сядзібу.

І вось стары сад стаў нечаканай апорай гаспадаркі. Яблыкі прадалі ажно ў Пецярбургу і зарабілі на іх дзве з паловай тысячы долараў.

Лёгка сказаць: прадалі, зарабілі. На самай справе ўсё было вельмі складанае. З вясны праз месяц афармлялі ў Віцебску

дазвол на вываз яблык. Безупынна трэба было ездзіць у аддаленую на некалькі соцень кіламетраў абласную сталіцу.

Транспарт у Пецярбург арганізавалі па сямейных сувязях. Праз сястру Святланы, якая жыве ў Пецярбургу, выйшлі на афганскі клуб. У гэтым клубе — былыя салдаты, якія ваявалі ў Афганістане, дапамагаюць наладзіць сабе жыццё. Хлопцы прыехалі грузавіком і забралі яблыкі ў Піцер, паверыўшы на слова, што грошы будуць ім заплачаны пасля продажу яблык. Цяпер яны з Сеялдковымі сябры.

З верасня па снежань Іван сам гандляваў яблыкамі ў Пецярбургу. Прадаваў іх усюды, нават у метро. Плаціў 3 тысячы расійскіх рублёў у дзень рэкецёрам за дазвол гандляваць. Настойвалі на яго і міліцыянеры, але пакольки не гаварылі ясна, чаго і колькі ім трэба, дык Іван не плаціў.

„Рэкецёры былі вельмі ветлівыя, — распавядае Іван. — Зашмат не дзёрлі, за руку здароўкаліся, „как дела?" пыталіся. Дык кажу ім, усё добра, гандаль ідзе, нават і больш мог бы вам плаціць, толькі міліцыя надаядае. Пасля гэтага міліцыянеры ад мяне адсталі", — канчае расказ Іван.

Піцерцы любяць кіславатыя яблыкі, каб у зубах хрусталі: перш за ўсё антонаўкі, але і ананас, і штрыфель, а ў жніўні — белы наліў. Канкурэнцыя пакуль што невялікая, з'яўляюцца з таварам палякі, але рынак такі аграмадны, што колькі на яго не кінеш, прападае бясследна.

Садаводства ды экспарт садавіны ў Пецярбург або Рыгу з'яўляецца мінулым і будучым гэтай аколіцы. Глеба тут вельмі кепская для плуга, таму прыходзіцца яблыні саджаць. Нават калгас носіць імя Мічурына і меў калісь аграмадныя сады. Людзі і савецкім часам вазілі яблыкі цэлымі грузавікамі ў Ленінград і Рыгу, пакуль нейкі старшыня не загадаў высекчы сады пад корань. Невядома толькі, ці гэта было самадурства мясцовага чыноўніка, ці вынік праводжанай тадышнім сакратаром Машэравым палітыкі пабольшання прадукцыі мяса якім-небудзь коштам.

Селядковы думаюць павялічыць сад. Іван заводзіць школку-гадавальнік. За заробленыя ў Пецярбургу грошы купіў „Жыгулі", „каб жонка адчула, што ёсць з гаспадаркі карысць",

— жартуе. Рэшту схавалі на чорны дзень. Сад, вядома, родзіць праз два гады і сёлета неўраджай. Усё-такі Селядковы будуюцца. Іван сваімі рукамі ставіць прыбудову, у якой прадугледжана перш за ўсё ванная і туалет. Прыбудова фешэнебельная, спалучаная са старым домам адмысловай перголай. Іван мае таксама праект на гумно (6 х 18 метраў), але трэба грошай, каб купіць драўніну. Новых машын не купляе, бо кожная новая машына патрабуе клопату, які яму ўжо не пад сілу. Праўда, прыдаўся б камбайн, або прынамсі малатарня. Цяпер, скасіўшы ўсё касою і касілкай, трэба прасіцца ў калгасе, каб далі камбайн змалаціць збожжа. Даць дык дадуць, але невядома калі, можа і ў лістападзе. Да гэтага часу збожжа ляжыць у кучах на полі.

Наогул стаўленне улад да фермераў змянілася на лепшае. З саляркай і бензінам няма праблемы. Селядковы ўзялі вясною 1,5 млн. рублёў крэдыту на аднолькавых умовах як і калгас. Гэты крэдыт мусяць сплаціць да 15 верасня. Клопату з тым не будзе, сцвярджаюць.

Станоўча ставяцца да павышэння цэн на сельгаспрадукты ў Беларусі. За жыта селянін дастае цяпер, у пераліку на долары 9-10 за цэнтнер, мяса: па нарыхтоўчых цэнах — паўдолара за кілаграм, а на рынку — долар, прычым свініна крыху даражэйшая за ялавічыну.

Новыя цэны бліжэй да справядлівасці, лічыць Іван. За тэхніку селянін мусіць жа плаціць па сусветных цэнах. Яшчэ 10 гадоў такой гаспадаркі вытрымалі б, але пасля ўсё праваліла-ся б, бо машыны ўстарэлі, а новых няма за што купіць.

Абое Селядковы прагаласавалі на прэзідэнцкіх выбарах за Пазьняка. „Доўга мы меркавалі, за каго галасаваць і як не глядзі, выходзіла, што толькі за Пазьняка, — кажуць згодна. — Я быў бы за Карпенку, калі б ён здолеў выйсці на выбары", — дабаўляе Іван. „Я за Пазьняка, хаця я руская, а ён рускіх не любіць, — кажа Святлана. — Усё ж такі краіну трэба ратаваць, калі ўжо так сталася, што нас раз'ядналі..." „Гаворыць радыё Масква!" — перабівае яе са смехам Іван, які таксама рускі, але тутэйшы, дык я няўпэўнены, ці яго ўласная жонка рускім лічыць.

Іван як селянін лічыць, што новае разнявольванне сялян непазбежнае. Мацуе яго ў гэтым веданне сітуацыі ў Літве. Паводле яго, гэта няпраўда, што ў Літве проста раскінулі калгасы і давялі тым сельскую гаспадарку да заняпаду. Уся зямля там аброблена, быццам бы граблямі заграблена. Нібыта няма руху, а ўсё зжата, падчас як на беларускім баку камбайны каціліся яшчэ туды і сюды. Літоўскія сяляне стварылі акцыянерныя таварыствы і ў некалькі суседзяў узялі камбайны і іншыя машыны. Няма калгасаў і старшынёў, а парадак ёсць.

У Беларусі людзі таксама ўзяліся б за гаспадарку, але трэба ім стварыць дзеля гэтага ўмовы. Перш за ўсё трэба высветліць юрыдычную сітуацыю. Зямля, якую маюць Селядковы, не прыватнаўласніцкая, але дадзена ім у г.зв. пажыццёвае спадчыннае карыстанне. Прадаваць яе звычайна нельга. Да таго, усе помняць, дзе была чыя зямля. Вось прыехалі палякі бацькаўшчыну наведаць, а сярод людзей успалох: на зямлі гэтых палякаў дзве вуліцы новых дамоў пабудаваны.

Другая справа — гэта састарэласць вёскі. „Мае суседзі — католікі, добрыя гаспадары, — кажа Іван. — Вось Вацак збожжа сабраў, невядома і калі. На жаль, у іх няма пераймальнікаў".

Пераймальнікам Івана будзе, магчыма, 15-гадовая дачка Ліка. Яна і на трактары ездзіць, і вярхом на кабыле не баіцца, хаця нядаўна ўпала і паламала руку. Просіць толькі бацькоў, каб сядло ёй купілі. Малодшая, Аня, дык больш задуменная, да кніжак схільная. „Кавалера для дзеўкі дык на вёсцы напэўна знойдзеце, горш з жонкай для селяніна", — дзялюся з Селядковымі вопытам Беласточчыны. Іван паглядае на майго 18-гадовага хросніка Юрку, вучня тэхнікума механізацыі сельскай гаспадаркі ў Супраслі, з якім увесь час вёў ён прафесійную дыскусію. Адразу відаць, якія думкі верцяцца ў галаве ў Івана...

Селядковы — відавочна, людзі незвычайныя. Тыповымі фермерамі іх ніяк не назавеш. З другога боку, хіба ж можа існаваць цяпер нехта такі, як тыповы беларускі фермер або проста селянін? Ва ўсім Браслаўскім раёне іх нямнога больш

за дзесятак і ў кожнага з іх напэўна свой адметны лёс. Яны пачынальнікі, а кожную справу пачынаюць людзі незвычайныя. Дай Бог, тутэйшая пакалечаная зямля зноў пакрыецца садамі, а гаспадарка Селядковых стане тыповай для гэтай аколіцы. Пэўне ж доўга прыйдзецца гэтага чакаць, але так яно і будзе.

Чым часцей наведваеш Браслаўскую зямлю, тым больш яна да сябе цягне. Зноў пускаюць у яе карані яблыні і людзі.

„Ніва" н-р 38 (2001) ад 18 верасня 1994 г.

БЕЛАРУСЬ — УСКРАІНА „ЕЎРАПЕЙСКАГА" ПРАВАСЛАЎЯ

Размова з Міколам Матрунчыкам — старшынёю Беларускага праваслаўнага брацтва Святых Віленскіх мучанікаў у Мінску.

— *Як узнікла Беларускае праваслаўнае брацтва?*

— Стварыла яго ў 1992 г. невялікае кола беларускай інтэлігенцыі, якое памкнулася з'яднацца вакол Петрапаўлаўскага сабора. За сабор ішлі спрэчкі. Пэўны час на яго прэтэндавала уніяцкая суполка і ладзіла набажэнствы на вуліцы. Прыходзілі тады і русафілы, якія спявалі „Боже, царя храни". Дык вось вакол айца Георгія Латушкі пачалі збірацца знаёмыя раней сабе праваслаўныя беларусы.

— *Ці ўсё абмяжоўвалася толькі да кола знаёмых?*

— Потым нас стала падштурхоўваць да дзейнасці тое, што пачалі кантактавацца з беларускімі праваслаўнымі прыходамі па-за межамі Беларусі, перш за ўсё амерыканскімі. Яны належаць да розных юрысдыкцый, але аб'ядноўвае іх думка, каб была беларуская Царква.

Вялікую ролю адыграў таксама мітрапаліт Філарэт. Ён у свой час глыбока адчуў ініцыятыву стварыць Брацтва, надае гэтаму вялікае значэнне і благаслаўляе. Дзякуючы таму прадухіліў зародкі раскольніцкіх ініцыятыў у Беларусі. На

глебе нацыянальнасці мог бы паўтарыцца ўкраінскі варыянт. У нас усё ідзе эвалюцыйна.

— З чаго пачалася канкрэтная дзейнасць Брацтва?

— Пачалі збіраць пераклады, якія былі зроблены да гэтай пары і спрабавалі ўвесці іх ва ўжыванне Праваслаўнай царквой у Беларусі. У 1993 г. на грунце гэтай ідэі заснавалі часопіс „Праваслаўе ў Беларусі і ў свеце". На нашу ціхую думку ён павінен аб'ядноўваць усіх праваслаўных беларусаў. Выдалі мы ўжо шэсць нумароў. Сталі выдаваць і праваслаўны каляндар.

— Як ставіліся іншыя да беларускіх праваслаўных выданняў?

— Назіраецца станоўчая змена падыходу сярод творчай інтэлігенцыі, напрыклад, да камісіі перакладу. Спачатку на яе прыходзілі, каб выказаць незадаволенасць і ўзаемныя абвінавачанні. Цяпер узяліся за працу. З дазволу мітрапаліта Філарэта інтэнсіўна перакладаецца Евангелле. Анатоль Клышка самастойна пераклаў Новы Запавет і рыхтуе новы лемантар. Уладзімір Мархель узяўся перакладаць Багагласнік. Складаем царкоўнаславянска-беларускі слоўнік. Цікавіцца ім, між іншымі, Алесь Разанаў і дае свае прапановы. Памалу прывыкаюць нават тыя спачатку вельмі варожыя. Паколькі ўсе засталіся пры сваім, гэта ўжо факт, які ўплывае на царкоўнае і грамадскае жыццё.

— Мова — гэта вельмі важны фактар у нацыянальным і рэлігійным жыцці, але не адзіны...

— Вялікую ўвагу пачынаем надаваць вывучэнню гісторыі праваслаўя ў Беларусі. Яна дагэтуль пісалася тэндэнцыйна расійскімі і савецкімі гісторыкамі. Патрэбнае новае асэнсаванне з беларускага пункту гледжання. Працуе ўжо Лабараторыя царкоўнай гісторыі, якая займаецца зборам, сістэматызацыяй і падрыхтоўкай да выдання адпаведных даследаванняў. Выдадзена ўжо першая кніжка: „Гісторыя Полацкай епархіі". Падрыхтавана „Гісторыя Мінскай епархіі". За імі пойдуць па чарзе гісторыі дзесяці епархіяў.

— Дагэтуль гаварылі мы толькі пра інтэлігенцыю. А як прымаюць абеларушванне Царквы духавенства і звычайныя

вернікі?

— Першыя гады адчувалася насцярожанасць. З цягам часу на нашы выданні пачаўся попыт і сярод святароў. Да нас сталі прыходзіць лісты з просьбамі даслаць каляндар. Раней цяжка было знайсці святара, які згадзіўся б даць пропаведзь на беларускай мове на нейкім святкаванні. Цяпер ёсць ахвотныя святары, якія быццам бы ўсё рыхтаваліся да таго.

— Калісь у Слуцку падчас святкавання ўгодкаў Слуцкага паўстання святар спярша згадзіўся адслужыць малебен, а калі прыйшло што да чаго — проста знік...

— Апошнім разам на святкаванні быў і святар, і хор. Дарэчы, у Слуцку дзейнічае актыўнае брацтва.

— Калі ўжо гаворым пра становішча па-за Мінскам: ці ваша Брацтва мае нейкія структуры па-за сталіцай?

— Спробы стварыць філіялы ў іншых месцах не даюць рэзультатаў, хаця звярталіся з тым да нас многія. Кожнае брацтва павінна мець прыхільнасць свайго епіскапа і настаяцеля. Таму ўзнікаюць самастойныя брацтвы, якія ўваходзяць у Злучнасць праваслаўных брацтваў Беларусі. Яна ўзнікла на базе і па ініцыятыве нашага Брацтва. У Злучнасці пятнаццаць брацтваў. На пачатку будучага года адбудзецца ўжо трэці яе З'езд.

Паколькі мы былі пачынальнікамі, усё, што ў Праваслаўнай царкве было звязанае з беларушчынай, стала асацыявацца з дзейнасцю нашага Брацтва. З нейкімі пытаннямі і патрабаваннямі ўсе звяртаюцца якраз да нас. Дзякуючы таму маем поўную і рэалістычную карціну таго, што ёсць Праваслаўная царква ў Беларусі і памкненняў святароў да беларушчыны. Можна сказаць — поўны банк інфармацыі.

— А як выглядае гэтая карціна?

— Выглядае перспектыўна. Еднасць вакол Царквы нацыянальна свядомых асоб прыцягвае моладзь з семінарыяў і свецкіх устаноў. Яны на семінарах „Сындэсмаса" бачаць, што ўсюды універсалізм праваслаўя неразрыўна звязаны з нацыянальнымі каштоўнасцямі. Такім чынам дзейнічае тое, што прароча гаворыць уладыка Мікалай з Канады: „Калі хочаце, каб Царква была беларуская, будзьце ў ёй".

Царква дазваляе мець кантакт з народам. Наш народ постсавецкі, нічога не зробіш. Усё-такі ў глыбіні душы верыць у Царкву. Можа не як ва ўстанову, але традыцыйнае месца выратавання. Калі ў тым месцы будзе інтэлігенцыя, можа будзе кантакт з „электаратам", на які ўсе толькі наракаюць, што ён не такі, як трэба.

— *Праваслаўныя брацтвы адрадзіліся на Беласточчыне на дзесяць гадоў раней, чымся ў Беларусі. Ці скарыстоўваеце іхні вопыт?*

— Шчыльны, непасрэдны кантакт з Беласточчынай дае нам вельмі многа. Пачаўся ён у 1993 годзе і ўсё болей нас натхняе. Прытым безупынна адчуваем падтрымку і прыхільнасць уладыкі Савы.

— *Ці праводзяцца нейкія супольныя мерапрыемствы?*

— Будзем аб тым раіць на пачатку лістапада, на сустрэчы цэнтральна-ўсходняга рэгіёна Еўропы „Сындэсмаса". Хочам наладзіць міжнароднае паломніцтва, каб адзначыць 400-годдзе віленскага Свята-Духаўскага манастыра і 650-годдзе праслаўлення святых віленскіх мучанікаў. Яны ўвасабляюць праваслаўе часоў Вялікага княства Літоўскага, якое ўсіх нас аб'ядноўвала.

Думаем таксама разам з „Сындэсмасам" або „Orthdruk"ам выдаць альбом, прысвечаны помнікам праваслаўнай архітэктуры часоў Вялікага княства Літоўскага на тэрыторыі Беларусі, Украіны, Літвы і Польшчы. Тагачасная архітэктура — гэта знакавае праяўленне нашай адметнасці.

Разам з Брацтвам пры Свята-Міхайлаўскай царкве ў Слуцку маем намер дабіцца таго, каб паломніцтвы з Беласточчыны даходзілі да месца, дзе быў Свята-Троіцкі манастыр у Слуцку. У ім у свой час знаходзіліся мошчы святога Гаўрыіла. Цяпер там зроблена часоўня. Вакол падрыхтаванае месца, каб размясціць паломнікаў.

— *Як можна ахарактарызаваць беларускае праваслаўе?*

— Стратэгічна Беларусь — ускраіна „еўрапейскага" праваслаўя. Жывем і будзем жыць у свеце, дзе ёсць не толькі праваслаўныя, але і католікі, і іншыя; дзе секулярызацыя будзе раз'ядаць асновы традыцыі, якую мы захоўвалі на працягу

тысячы гадоў, і на грунце якой узнік наш народ.

За Беларуссю пачынаецца іншае праваслаўе.

— *Дзякую за размову.*

Гутарыў **Алег Латышонак**

„Ніва" н-р 38 (2106) ад 22 верасня 1996 г.

ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ

Так склалася, што ў Беларусі не быў я ажно два гады. Таму з вялікай цікаўнасцю чакаў сустрэчы з беларускай сталіцай.

Першае ўражанне такое, што чуткі аб смерці беларускай гаспадаркі аказаліся заўчаснымі. Сям-там нешта будуецца. У цэнтры ўзніклі шыкарныя крамы самых разнастайных заходніх фірмаў. У кватэрах цёпла, а з кранаў цячэ гарачая вада. Калі выпаў першы снег, зараз жа сталі яго прыбіраць. Заводы працуюць нерэгулярна, але работнікі атрымоўваюць зарплату, як за нармальную працу. У тым часе можна абрабляць свой участак зямлі, або заняцца нейкай іншай карыснай справай. Былі павышаны пенсіі і нават рэваларызаваны ашчадныя ўкладанні. Хлеб танны, гарэлка амаль дармовая. Усё іншае страшэнна дарагое, але ні голаду, ні холаду ў Беларусі няма.

Апазіцыйна настроеныя сябры і знаёмыя зараз жа пачынаюць тлумачыць, што гэта ўсё паказуха. Малака не дастаць, пліткі на тратуары кладуць толькі таму, каб паказаць, што ў горадзе і краіне ёсць гаспадар. Сябры і знаёмыя з-па-за Мінска расказваюць, што ў іншых гарадах транспарт ходзіць намнога горш, а вуліцы не асвятляюцца дастаткова. Бізнесмены наракаюць, што сталі іх душыць. Лідэры апазіцыі заяўляюць, што ў дзяржаўным банку няма грошай і неўзабаве трэба будзе друкаваць пустыя паперкі, пачнецца інфляцыя і агульны эканамічны крах.

Пэўне ж так і будзе, але скуль тое ведаць звычайнаму чалавеку? Як ні глядзі, прэзідэнт Лукашэнка ў часе рэферэндуму здолеў стварыць уражанне, што ў краіне можна жыць. У параўнанні з Украінай, дзе я бачыў сапраўдную нэндзу,

нават не так і кепска. І для ўсіх ясна, што гэтае „не так і кепска” магчымае дзякуючы добрым адносінам з Расіяй.

Выглядала, што прэзідэнт Лукашэнка павінен быў выйграць канстытуцыйны рэферэндум без надзвычайных намаганняў. Дык дзеля чаго спатрэбілася яму вайна з Вярхоўным Саветам за спосаб правядзення таго ж рэферэндуму? Чаму прэзідэнт, расцягваючы рэферэндум на два тыдні, звальняючы старшыню Цэнтральнай выбарчай камісіі і праводзячы галасаванне „грамадскім” чынам прымусіў кожнага аб’ектыўнага наглядальніка сумняваццa ў выніках рэферэндуму?

На мой погляд, прычыны могуць быць тры. Вось яны, пачынаючы з найменш важнай.

Правядзенне рэферэндуму адначасова з давыбарамі ў Вярхоўны Савет зрабіла б непазбежным узаконенне гэтых другіх, паколькі грамадзяне, галасуючы ў рэферэндуме, галасавалі б і ў давыбарах. Такім чынам Вярхоўны Савет замацаваў бы сваю пазіцыю. Поўны колькасна Вярхоўны Савет быў бы праўдападобна яшчэ больш антыпрэзідэнцкі, паколькі былі спадзяванні, што папоўняць яго галоўным чынам апазіцыянеры.

Выбаршчыкі Лукашэнкі гэта шэрыя людзі. Наогул яны ў палітыку не ўмешваюцца. Тое, дзеля чаго робіцца чарговы рэферэндум, магло быць для гэтых людзей не зусім ясным. Вярхоўны Савет і так зацвярджаў усё, што задумаў прэзідэнт ды выказваўся за аб’яднанне з Расіяй. Такім чынам, каб выцягнуць сваіх прыхільнікаў з хаты, прэзідэнт мусіў паказаць ім ворага. Вярхоўны Савет не мог згадзіцца на далейшую самаволю прэзідэнта, бо гэта абазначала б канец Вярхоўнаму Савету. Таксама кіраўніцтва Беларускага Народнага Фронту не магло не падтрымаць Вярхоўны Савет у змаганні з прэзідэнтам, паколькі было перакананае, што разгон парламента абазначае канец якой-небудзь легальнай апазіцыі. І прэзідэнт мог паказаць народу: „Вось мае ворагі: камуністы і нацыяналісты”. Дарэчы, якраз у гэтым прэзідэнт не хлусіў. Магчыма памыляюся, але не варта было Фронту лезці ў гульню, у якой прадбачвалася яго прыхільнікам роля выключна гарматняга мяса.

Нарэшце, ёсць усё-такі і такая магчымасць, што прэзідэнт зняверыўся ва ўсенародную падтрымку сваёй асобы. Хаця

амаль усе пішуць пра тое, што прэзідэнт Лукашэнка мае такую падтрымку, можна ў гэтым сапраўды сумняваццa. Гэтыя самыя людзі, якія называюць прэзідэнта Беларусі „калхознікам", усю Беларусь уяўляюць сабе як калгас. Тым часам прэзідэнт Беларусі — гэта афіцэр-палітрук, а на вёсцы жыве ўсяго 30% беларусаў. Так што калгаснікаў ніяк не хапае, каб атрымалася ўсенародная падтрымка.

Да таго ў шматлікіх сельскіх раёнах у Заходняй Беларусі кандыдаты БНФ ва ўсяго роду выбарах атрымоўвалі больш за 30% галасоў. Не ведаю, як у іншых гарадах, але ў Мінску панавала перш за ўсё пазіцыя назіральніцтва. Наогул усе каментатары падкрэсліваюць, што падтрымку Вярхоўнаму Савету дэманстравала на плошчы Незалежнасці толькі некалькі тысяч чалавек. Але ж у гэты самы час нічым скончыліся двухдзённыя намаганні адміністрацыі прэзідэнта склікаць на гэтай жа плошчы мітынг у падтрымку Лукашэнкі. На заводы былі падстаўлены адмысловыя аўтобусы, але ніхто ў іх не сеў. Людзі, выходзячы з працы, проста прайшлі міма. На плошчы з'явілася ўсяго некалькі соцень прыхільнікаў прэзідэнта.

Вечарам у чацвер выглядала, што прэзідэнта падтрымоўвае ўжо толькі камандзір яго асабістай аховы, які выступіў па тэлебачанні з заявай, што пануе над сітуацыяй. Вярхоўны Савет загнаў прэзідэнта ў кут, аб чым відавочна сведчыў яго сшарэлы твар.

Усё-такі Вярхоўны Савет таксама не адважыўся правяраць, колькі людзей будзе яго падтрымоўваць да самага канца. Здаецца, зрэшты, што не столькі не меў адвагі, што наогул аб нечым такім і не думаў. Вярхоўны Савет дзейнічаў паводле адзінага вядомага сабе савецкага ўзору. Аб'вясціўшы імпічмент прэзідэнту, звярнуўся пра канчатковае рашэнне ў Маскву (чытай: ЦК выказаў недавер рэспубліканскаму першаму сакратару і звярнуўся аб рашэнні да ўсесаюзнага ЦК). Трэба ж было бачыць (у расійскім тэлебачанні) як старшыня Вярхоўнага Савета Сямён Шарэцкі ўпіўся ў губы старшыні расійскай Думы Генадзя Селязнёва. Проста — з засосам. Не памагло. Расіяне вырашылі падтрымаць прэзідэнта Лукашэнку.

„Барин приехал, барин рассудил". У пятніцу раніцай стала ясным, што ніякая беларуская дзяржава не існуе.

Выдатныя расійскія дзяржаўныя дзеячы сталі завяраць публічна, што беларуская армія і КДБ фактычна расійскія (што, дарэчы, тлумачыць іхнюю пасіўнасць ва ўсіх падзеях). Прэзідэнт Лукашэнка за адну ноч з усенароднаабранага стаў нічым не прыкрытым маскоўскім стаўленікам.

Калі наглядаеш дзеянні беларускіх палітыкаў, згадваеш загаловак Мележавага рамана „Людзі на балоце". Беларускае грамадства ў сэнсе палітычным напамінае „балота" вядомае з парламента рэвалюцыйнай Францыі. Толькі булькнула, калі ў твань праваліўся з галавою Пазьняк. Чуцен толькі яго голас з іншага свету. Ізноў толькі булькнула, калі ў след за Пазьняком танулі Шушкевіч, Кебіч, Ґрыб, Шарэцкі. Усе, хто так заядла і бяздумна змагаўся за ўладу над гэтым балотам. Прэзідэнт Лукашэнка сядзеў ужо ў балоце па шыю і выратавала яго толькі пададзеная ў час рука Масквы.

Усё-такі на гэтым балоце паволі растуць і мацуюцца астраўкі сушы. Такія астраўкі ствараюць кожная палітычная, культурная ці прафсаюзная арганізацыі, кожны прыход, парафія і збор. Упарта будуюць свае астраўкі сушы прадпрымальнікі. Мільён самых малых, але сваіх стварылі тыя, хто за незалежную Беларусь.

Беларусь — гэта не „чорная дзірка", як здаецца шмат каму ў свеце, нават у суседняй Польшчы. Краіна мяняецца, хаця паволі і для чужога вока непрыкметна і мяняецца не так, як хацелася б рознага роду праектантам яе шчаслівай будучыні.

На канец выкажу думку, якая пэўне ж шмат кім успрымецца як ерась.

Не люблю я ні г.зв. народу, ні прэзідэнта Лукашэнкі. Усё-такі прэзідэнт Лукашэнка гэта першы ў гісторыі Беларусі (не лічачы часоў легендарнага полацкага веча) кіраўнік, які запытаўся ў народа, што ён думае пра самыя істотныя пытанні. Сталася так у першым рэферэндуме. Адказ быў адназначны і сэнсу гэтага адказу не мяняе закалот з цяперашнім рэферэндумам.

Адказ дадзены народам мне не даспадобы. Усё-такі беларуская дзяржава мае быць для людзей. Можна заганяць іх у беларускасць крыкам, як гэта рабіў БНФ, можна і тэрорам. На маю думку, Беларусь ужо апынулася на мяжы тэрору. Тым не менш, калі лічыць далучэнне Беларусі да Расіі шкодным, дык самы просты, а можа і адзіны спосаб, каб пераканаць аб тым беларусаў, гэта здзейсніць гэтае далучэнне. Калі акажацца, што далучэнне сапраўды шкоднае, безумоўна з'явіцца беларускі нацыянальна-вызвольны рух, які атрымае грамадскую падтрымку.

Апошнія падзеі паказалі зрэшты, што ніякай рэальнай грамадскай сілы па-за беларускім нацыянальным рухам у Беларусі не існуе.

Адзін гарласты расійскі журналіст прадугледзіў ужо будучы статус Беларусі ў рамках Расійскай Федэрацыі. Гэта мае быць такі самы статус як у Чачні. Два гады таму, калі пачалася расійска-чачэнская вайна, напісаў я ў „Ніве", што Расіі не выйграць гэтай вайны. Таксама не ўтрымаць ёй Беларусі супраць волі саміх беларусаў.

„Ніва" н-р 50 (2118) ад 15 снежня 1996 г.

БЕЛАСТОЧЧЫНА ЯК ПРЫДНЯСТРОЎЕ АБО СТРАСЦІ ВАКОЛ З'ЕЗДА

II З'езд беларусаў свету павіс у паветры напярэдадні назначанай даты нарадаў. З'езд павінен пачацца ў суботу, 26 ліпеня, але ў пятніцу аказалася, што Тэатр музычнай камедыі ў Мінску, якога залу зняло пад з'езд Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына", не адпавядае нормам супрацьпажарнага забеспячэння. Вядома, ніхто ў такую прычыну адмаўлення залы не паверыў і ў свет пайшла інфармацыя аб спробе сарвання з'езда.

Пад вечар улада адумалася і раніцай у суботу з'езд пачаў працаваць у раней назначаным месцы. Тым не менш, „супрацьпажарная" мітусня настолькі ўзлавала ўдзельнікаў з'езда, што свістамі і воклічамі „ганьба" не дазволілі зачытаць пасланне прэзідэнта Лукашэнкі. Усё-такі прэзідэнцкая адміністрацыя не здалася і пачала закулісную працу над выбранымі ўдзельнікамі з'езда. Паволі пачала фармавацца плынь апраўдання прэзідэнта. Увайшлі ў гэтую плынь і прадстаўнікі БГКТ, якія ў сіле поўнага аўтобуса прыбылі на з'езд. Асаблівую славу прыдбала сабе сп. Ніна Цыванюк, якая выступіла ў суботу па Беларускім тэлебачанні з крытыкай паводзін удзельнікаў з'езда падчас зачытвання прэзідэнцкага паслання. Гэтая ж бойкая жанчына ў нядзелю дала адпор католікам, знаходзячы апанента ў асобе уніяцкага святара а. Яна Матусевіча.

Ад імя каго з вядомых людзей беларускай культуры выслухаў я дакоры ўбок беластачан і разгубленыя пытанні, у чым тут справа. Наогул, Беласточчыну пачалі раўняць з Прыднястроўем, якога прадстаўнікі вылучаліся з ліку ўдзельнікаў З'езда тугой па колішняй „вялікай радзіме". Я нават пачуў, як ад'езд беластоцкага „Аўтасана" хтосьці пракаментаваў: „Паехала Прыднястроўе". Каб толькі гэты каментатар быў фальшывым прарокам.

З суботняга вечара некаторыя ўдзельнікі пачалі разважаць: ісці ці не ісці на сустрэчу з прэзідэнтам Лукашэнкам. Запрашэнні з'явіліся ні адсюль ні адтуль. Як можна было пачуць, некаторыя дэлегаты з абшару колішняга СССР хадзілі раней на сустрэчу з палкоўнікам савецкага КГБ, сёння віцэ-прэм'ерам Уладзімірам Замяталіным. Хто пайшоў, гледачы БТ маглі пабачыць у панядзелак вечарам.

Іншая частка ўдзельнікаў, таксама па-за праграмай З'езда, далучылася да шэсця, арганізаванага апазіцыяй з нагоды скасаванага прэзідэнтам Дня Незалежнасці. Каля 5 тысяч дэманстрантаў прайшлі з плошчы Якуба Коласа пад Оперны тэатр. Шэсце адбывалася спакойна, хаця ўдзельнікі без дазволу ўлад выйшлі на вуліцу (у Мінску звычайна дазваляюць пратэставаць на тратуары). Большая частка шэсця адбылася ў парку. Некаторыя гаварылі: у кустах, а іншыя пыталіся ры-

тарычна: колькі яшчэ так будзем хадзіць. Лібералы пусцілі на воды Свіслачы некалькі малых караблёў з бел-чырвона-белымі сцяжкамі, але падуў вецер і караблі вывернуліся.

Ля Опернага тэатра прамовілі прамоўцы, заспявалі спевакі, запушчаны быў паветраны шар з бел-чырвона-белым сцягам і спалены аграмадны павук на павуцінні, які сімвалізаваў нямодную ўладу. Канцэрт рок-гуртоў не адбыўся, паколькі ад ранку „прапаў" электраток. Цікава было паглядзець за стракатым складам мітынгоўцаў. Былі тут звычайныя „нацыяналісты" з рознага роду бел-чырвона-белымі ўпрыгожаннямі: майкамі, шапкамі і парасонамі. Сярод іх красаваліся рокеры, металісты і г.п. у чорных майках з назвамі ўлюбёных гуртоў. Увагу прыцягваў а. Пётр з Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Аказваецца, што ўжо ў Беларусі ёсць і такая царква, ды не толькі ў Сёмкавым Гарадку (непадалёк Мінска), адкуль прыехаў гэты праваслаўны святар. Пастар Ліпань ад рэфармаваных евангелікаў (кальвіністаў) прыехаў на веласіпедзе і пачаў дакараць прысутных у тым, што абагаўляюць нацыю і сапраўды ў нічым не лепшыя за тых, якія шпацыруюць па парку па-за нацыянальнымі прычынамі. Увагай мітынгоўцаў ён не карыстаўся.

Толькі як удзельнікі мітынгу пачалі разыходзіцца, вядомыя службы пачалі хапаць выбраных у машыны, нават падлеткаў. Адзін газік заехаў нават пад рэстаран „Кветка-папараць", у якім удзельнікі з'езда святкавалі заканчэнне нарадаў. Кажуць, міліцыя заехала з намерам хапануць аднаго з завадатараў шэсця, які банкетаваў сярод беларусаў свету.

II З'езд згаданых беларусаў адбыўся. Выбраны былі нанава прэзідэнт ЗБС „Бацькаўшчына" Радзім Гарэцкі, перавыбраны Вялікая і Малая рады. Старшынёй Рады застаецца Ганна Сурмач. Такім чынам улады „Бацькаўшчыны" могуць лічыць з'езд сваім поспехам, бо згуртаванне можа надалей працаваць згодна са сваім статутам. Але наўрад ці на спакойную працу дазволяць улады Рэспублікі Беларусь. Відаць, рацыю мелі амерыканскія беларусы, якія адмовіліся прымаць удзел у мерапрыемстве, праводжаным у такіх палітычных абставінах.

„Ніва" н-р 32 (2152) ад 10 жніўня 1997 г.

НА КАТАЛІЦКІЯ КАЛЯДЫ Ў МІНСКУ

Беларусь гэта адзіная краіна ў свеце, дзе Хрыстова Нараджэнне як дзяржаўнае свята адзначаецца двойчы, паводле старога і новага стыляў.

Сёлета давялося мне наведаць Мінск якраз у час „першых" Каляд. Ехаў я з намерам упрасіцца на Куццю да кагосьці са сваіх сяброў-католікаў. На месцы выявілася, што ажыццявіць гэты намер немагчыма. І не з прычыны негасціннасці мінчан — проста ніхто са знаёмых католікаў Куццю не спраўляў. Нехта можа і святкаваў, але не хапіла мне часу і настойлівасці, каб званіць і шукаць такіх. У выніку, калядны вечар правёў я за пляшкай віна ў праваслаўнага земляка Валодзі Паца і яго маладой жонкі-мінчанкі Тані.

Раней, у сем гадзін вечара, пайшоў я на Пастэрку у г.зв. „чырвоны" касцёл (святых Сімяона і Алены) на Плошчы Незалежнасці.

Касцёл быў поўны. Ля ўвахода наглядаўся невялікі рух — прахожыя заглядалі, што гэта такое адбываецца ў касцёле. Некаторыя нават не здымалі з галоваў вялізных футравых вушанак, улюбёнага галаўнога ўбору мужчынскага полу.

Усяночная пачалася польскай калядкай „Wśród nocnej ciszy", аўтарства нашага земляка Францішка Карпінскага. Хор спяваў так неймаверна павольна, так расцягваў кожны радок, што карэнны паляк, мусіць, завыў бы ад роспачы, чуючы такое. Пасля адспявалі яшчэ „Przybieżeli do Betlejem", а далей пайшла беларускамоўная імша.

Наогул у каталіцкай царкве пашыраецца беларусізацыя. Нават кардынал Свёнтак ламаў язык, звяртаючыся да народа з калядным пасланнем на беларускай мове. Усе знаёмыя назіральнікі згодна запэўнівалі мяне, што паскораная беларусізацыя — гэта заслуга прэзідэнта Лукашэнкі, які некалькі разоў намякнуў быў публічна на нейкіх агентаў чужых дзяржаў.

На першы дзень Калядных святаў я паехаў у Заслаўе, у гісторыка-культурны музей-запаведнік. У гэты дзень у запаведніку ўрачыста адкрывалі свіран. З гэтай нагоды наладжаны быў маленькі народны кірмаш. Паказваліся кірмашовыя сцэны і калядаванне з мядзведзем і казою. Рэлігійных матываў у калядных гульнях я не заўважыў. Сярод нешматлікай публікі панавала атмасфера натуральнай забавы. Поўдзень у Заслаўі запісаўся ў маёй памяці колерамі народных строяў на белым снезе, якога тады яшчэ было поўна, і святочным настроем. Пасля кірмашу наведаў я яшчэ касцёл, які адбудоўваецца дзякуючы дзяржаўнай датацыі (тры гады па 2 мільярды рублёў) і працы нешматлікіх прыхаджан. У 30-тысячным Заслаўі актыўных католікаў усяго 150 чалавек, але ў адбудову касцёла ўкладаюць яны ўсю душу.

Зведаў я таксама і старадаўнюю царкву (пабудаваную ў XVI ст. як кальвінісцкі збор). Царкву трэба будзе рамантаваць, бо згарэла ўсярэдзіне. Чаму гарэла, кажуць па-рознаму: ці-то падпалілі сатаністы, ці-то сам бацюшка, выплаўляючы свечкі.

Папаў я на момант і на святочны прыём, які наладзілі супрацоўнікі запаведніка для ўсіх, хто ў ім працаваў, працуе і з ім сябруе.

Аказваецца, святочныя сустрэчы сяброў па працы і змаганні гэта новазароджаная традыцыя ў Беларусі. Вечар правёў я ў рэстаране на Траецкім прадмесці, дзе прыём наладзілі супрацоўнікі Музея Багдановіча і газеты „Свабода". Стол быў багаты, строі, асабліва дам, вечаровыя. Наогул, як у нас на Сільвестра „па-раз першы і другі", так што я мог надзець нават матылёк. Толькі ногі ў танцы ніяк не патраплялі ў такт расійскай „папсы", якая лілася з эстрады.

Асабліва запамяталіся мне з гэтага вечара тосты. Як дырэктар Музея Алесь Бяляцкі, так галоўны рэдактар „Свабоды" Ігар Гермянчук прапаноўвалі згодна і незалежна (Гермянчук спазніўся і не чуў тосту Бяляцкага) выпіць за перамену ў новым годзе. Хіба ж трэба лепшага доказу небеларускасці апазіцыянераў? Сапраўдныя беларусы за тое, каб не было горш, а перш за ўсё за тое, каб не было вайны.

Наступныя тры дні мінчане святкавалі з сям'ёю і сябрамі або адпачывалі. Пасля доўгіх святкаванняў-несвяткаванняў сяк-так працавалі ў панядзелак. У аўторак пасля поўдня ўжо развіталіся са старым годам у кампаніі сяброў па працы і змаганні. На галоўных вуліцах сталіцы быў страшэнны рух, з якім і не параўнаць „шал святочных пакупак" у правінцыйным Беластоку. Метро безупынна выплёўвала натоўпы людзей, прагных купіць падарункі на Новы год.

Менавіта Новы год па савецкай традыцыі лічыцца ў Мінску самым сямейным святам. Усе праваслаўныя знаёмыя бажыліся, што праваслаўныя Каляды выглядаюць у Мінску таксама ніштожна, як каталіцкія.

Пад Новы год з'явілася ў горадзе сякая-такая ілюмінацыя, напрыклад, чырвоныя зоркі на вяршынях ялінак.

Новага года ў Мінску я ўжо не дачакаў. Насычаны ежай і напіткамі павалокся я дахаты, каб сабраць сілы на святкаванні наводле старога стылю.

„Ніва" н-р 3 (2175) ад 18 студзеня 1998 г.

KAMUNIKAT.ORG